Як дзяржава падтрымлівае сем'і, што выхоўваюць дзяцей

Тры пытанні да Міністэрства працы і сацыяльнай абароны

Раскажыце, калі ласка, на якую дапамогу па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў могуць разлічваць жанчыны — індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі? Можа, у найбліжэйшы час плануюцца нейкія заканадаўчыя змены, якія іх закрануць?

Юлія Цынкевіч, *г. Віцебск.*

Адказвае кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ:

— Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў вызначаецца ў залежнасці ад колькасці дзяцей, якія выхоўваюцца ў сям'і, і занятасці асобы, што ажыццяўляе догляд дзіцяці.

Поўны памер дапамогі ўсталяваны для сем'яў, у якіх адзін з бацькоў, які ажыццяўляе догляд дзіцяці, страчвае ў сувязі з гэтым прыбытак або працуе па працоўным дагаворы (кантракце) на ўмовах не больш за палову месячнай нормы працоўнага часу альбо дома.

Дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў і рамеснікаў прадугледжвае самастойную арганізацыю сваёй занятасці і не рэгулюецца нормамі заканадаўства аб працы (не прадугледжвае нармавання рабочага часу, давання працоўных і сацыяльных водпускаў, устанаўлення мінімальнага ўзроўню аплаты працы).

Калі ў перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў асобы ажыццяўляюць прадпрымальніцкую ці рамесніцкую дзейнасць, то дапамогі ім прызначаюцца і выплачваюцца ў памеры 50 % ад поўнага памеру.

Разам з тым індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі маюць такія перавагі, як магчымасць самастойна арганізоўваць рабочае месца і рабочы час; карыстацца правам выплаты абавязковых страхавых унёскаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва пры жаданні мець дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне — гэта значыць, выплачваць унёскі ў бюджэт фонду ў добраахвотным парадку.

Акрамя таго, у іх ёсць магчымасць атрымліваць дапамогу ў поўным памеры ў выпадку прыпынення адпаведнай дзейнасці, у тым ліку ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама неажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ў сувязі са знаходжаннем у працэсе спынення дзейнасці. Пры гэтым індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі не абмежаваныя ў працягласці і перыядычнасці прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Працэдура прыпынення і аднаўлення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў максімальна спрошчана і заключаецца ў падачы адпаведнай заявы ў падатковыя органы.

У выпадку прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў дапамога ў поўным памеры выплачваецца з першага чысла месяца, наступнага за месяцам прыпынення дзейнасці. Пры аднаўленні дзейнасці пераразлік дапамогі ў памеры 50 % ад устаноўленага памеру здзяйсняецца з першага дня месяца, наступнага за месяцам, у якім дзейнасць была адноўлена.

Што датычыцца ўнясення змяненняў у заканадаўства, у цяперашні час яны не плануюцца.



* * *

Куды звяртацца па прызначэнне дапамог на дзяцей, калі бацькі працуюць у некамерцыйнай арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек?

Аляксандр Іўчанка, *г. Бяроза.*

— Парадак прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, рэгулюецца нормамі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Месца прызначэння дзяржаўных дапамог вызначана ў арт. 21 закона. Дзяржаўныя дапамогі жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, у сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў, у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаюцца ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў выпадку, калі:

1) абодва бацькі ў поўнай сям'і ці адзін з іх у няпоўнай сям'і, усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель) дзіцяці:

працуюць у камерцыйных арганізацыях з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна;

працуюць у рэлігійных арганізацыях; з'яўляюцца святарамі;

2) маці (мачаха) дзіцяці ў поўнай сям'і працуе ў камерцыйнай арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна або ў рэлігійнай арганізацыі.

Калі арганізацыя з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна некамерцыйная, і пры гэтым яна не адносіцца да рэлігійнай арганізацыі, дзяржаўныя дапамогі выплачваюцца не ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а ў самой арганізацыі.

* * *

У нас у сям'і дзіця-інвалід (старэйшае за 3 гады), мая жонка не працуе, даглядае яго і атрымлівае ў органах сацыяльнай абароны дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Ці можна мне прызначыць па месцы працы яшчэ адну дапамогу на дзіця-інваліда?

Сяргей, *г. Мінск.*

Начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера ЛАБКОВІЧ:

— Калі ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід, па месцы працы аднаго з бацькоў выплачваецца дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, якая назначаецца штогод пры выкананні ўмоў занятасці бацькі (айчыма) у поўнай сям'і ці аднаго з бацькоў у няпоўнай сям'і. Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў прызначаецца толькі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Права на яго прызначэнне разглядаецца незалежна ад атрымання на дзяцей, у тым ліку на дзіця-інваліда, іншых відаў дзяржаўных дапамог.

Таму, калі ў поўнай сям'і маці атрымлівае ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а бацька працуе, па месцы працы бацькі прызначаецца іншы від дзяржаўнай дапамогі — дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў. Пры гэтым дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца на кожнае дзіця, старэйшае за 3 гады: на дзіця-інваліда ў памеры 70 % бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, на іншых дзяцей — 50 % (пры выкананні бацькам умоў занятасці).

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

Прававая гасцёўня

ДЭКРЭТНЫ АДПАЧЫНАК ЦАЛКАМІ І ЧАСТКАМІ

Колькі разоў выходзіць на работу і вяртацца ў дэкрэт на працягу трох гадоў, вызначае жанчына

Тры месяцы таму я знаходзілася ў дэкрэце. Калі малому споўнілася два гады, вярнулася на работу. Аднак не заладзілася з дзіцячым садком, таму вырашыла вярнуцца і дабыць з сынам тэрмін па доглядзе за дзіцем да трох гадоў, які дазваляе наша заканадаўства. Аднак кіраўніцтва сказала, што я не магу так зрабіць. Выйшла — значыць, працуй. Прапануе сыходзіць у адпачынак за свой кошт альбо ў наступны дэкрэт з другім дзіцем. Ці маюць яны рацыю ў такіх патрабаваннях? Мая сяброўка, казала, што яна так рабіла: выходзіла на работу і вярталася назад у дэкрэт і нават грошы дэкрэтныя не страчвала. Ці такія магчымасці залежаць ад канкрэтнага прадпрыемства?

Вольга Ч., *г. Мінск.*

На пытанне адказвае Дар'я ГРЫЦКЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Водпуск па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў замацаваны ў артыкуле 185 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Абавязак наймальніка — даць гэты водпуск па жаданні працуючай жанчыны на падставе яе пісьмовай заявы незалежна ад працоўнага стажу. Яна можа выкарыстаць яго поўнасцю або падзяліць на часткі любой працягласці. Так што **адмовіць у вяртанні ў дэкрэтны адпачынак нават пасля выхаду на работу наймальнік не мае права.** Вы можаце выходзіць на работу і вяртацца ў дэкрэт столькі разоў, колькі трэба, разбіваць яго на пэўныя перыяды і выкарыстоўваць часткамі любой працягласці, пакуль дзіцяці не споўніцца тры гады.

Звяртаю вашу ўвагу, што заканадаўствам не прадугледжаны тэрмін, за які трэба папярэдзіць наймальніка аб намеры пайсці ў водпуск па доглядзе за дзіцем да трох гадоў. Гэты водпуск прадастаўляецца з даты, якая пазначана ў заяве.

Акрамя таго, у выпадку выхаду на работу раней вызначанага тэрміну выплата дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў праводзіцца да дня дасягнення малым трох гадоў уключна. Гэта вызначана Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Так што пры выхадзе работніцы на працу дапамога не знікае, можа толькі змяніцца яе велічыня. Так, дапамога назначаецца і выплачваецца ў памеры 50 % ад яе поўнай колькасці, у тым ліку калі асоба, якая ажыццяўляе догляд за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў, працуе на ўмовах поўнага рабочага часу, няпоўнага рабочага часу (больш за палову месячнай нормы рабочага часу) у аднаго або некалькіх наймальнікаў.

Пры ўзнікненні абставін, якія ўплываюць на памер назначанай дапамогі, яе велічыня мяняецца з першага дня месяца, які ідзе следам за месяцам узнікнення такіх абставін.

Памер дапамогі не пераглядаецца, калі абставіны, якія ўплываюць на яе велічыню, заканчваюцца ў месяцы іх узнікнення. Гэта вызначана Палажэннем аб парадку прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2013 года № 569 «Аб мерах па рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы.